**Святлана Чувак**
(Гародня)

## Якуб Колас і Заходняя Беларусь

У год святкавання 120-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа з прыкрасцю заўважалася, што сярод мноства даследаванняў, прысвечаных творчасці пісьменніка, які мае такія гучныя тытулы як класік беларускай літаратуры, пясняр роднай зямлі, пры характарыстыцы твораў якога ўжываюцца эпітэты вышэйшай ступені параўнання, некаторыя старонкі яго жыцця і творчасці або не асветлены, або ацэньваюцца з пункту гледжання догмаў камуністычнай ідэалогіі. Адным з такіх перыядаў у творчасці Я. Коласа сталі 20-30-ыя гады.

У 1926 г. Я. Коласу было прысвоена званне народнага пісьменніка, урадам была падаравана дача і аўтамабіль, ён быў абраны віцэ-прэзідэнтам Беларускай Акадэміі Навук, выступаў на шматлікіх канферэнцыях, кангрэсах, з'ездах. Творы паэта актыўна выдаваліся, выходзілі юбілейныя зборнікі (*Якуб Колас у літаратурнай крытыцы*, Мінск 1926).

А з другога боку вельмі многія факты, якія абыходзіліся раней, супярэчаць вобразу „асыпанага" ўвагай уладаў савецкага паэта. Крытыка абвінавачвала Я. Коласа ў „мужыкафільстве, у любаванні «забабоннай і ўгразшай вёскай ды нетрамі дзікай прыроды»"[1]. У паэме *Новая зямля* бачылі „дзікі народніцка-інтэлігенцкі патрыятызм і ўласніцкія прывычкі", ідэалізацыю хутарской гаспадаркі, пропаведзь адасобленасці і індывідуалізм. Твор

[1] М. Мушынскі, *Якуб Колас у літаратурнай крытыцы*, „Полымя", 1972, № 11, с. 172.

гэты быў абвешчаны натуралістычным, немастацкім, архаічным „як з ідэёвага боку, так і па форме”[2]. Вядома, што ўжо ў 1925 г. у Якуба Коласа праводзілі вобыск, выклікалі на допыты, інкрымінавалі арганізацыю і кіраўніцтва „мінскай антысавецкай арганізацыі”[3]. У лютым 1938 г. быў арыштаваны А. Каменскі, брат жонкі Якуба Коласа, які жыў у доме паэта. Зноў быў вобыск: шукалі матэрыялы на новую „справу”, а „настаўніка Каменскага вымушалі даць паказанні на паэта Я. Коласа”[4].

Паводле лістоў змешчаных у 11 томе збору твораў пісьменніка вельмі дзіўнай выглядае перапіска з Я. Карскім, даволі актыўная ў 1921–1922 гг. з мноствам прапаноў аб супрацоўніцтве. Затым яна спыняецца і застаецца толькі адзіны ліст 1926 года, ды і той больш падобны на адпіску. З ліста да жонкі ад 2 верасня 1926 г. даведваемся, што ў Я. Коласа былі пісьмовыя кантакты з А. Цвікевічам, але ніводнага ліста не надрукавана. Як няма і перапіскі з братамі і сёстрамі, якія воляю лёсу засталіся за мяжою, на польскім баку. З большай верагоднасцю можна меркаваць, што лісты, адсутнасць якіх узгадвалася вышэй, былі знішчаны самім паэтам дзеля асабістай бяспекі.

Пісьменнік з 1915 г. не быў на сваёй малой радзіме, але ні ў эпісталярнай спадчыне, ні ў лірыцы, тым больш прозе мы не знаходзім адлюстравання гэтай акалічнасці. Выключэнне складае верш „З дарогі”. Ды і там толькі першая частка прасякнута празрыстым сумам, чуллівай радасцю сустрэчы з роднымі мясцінамі:

Я свет угледзеў там,
Пазнаў складанасць гам яго і тонаў,
Адчуў дзівосны храм –
Злучэнне бляску, плям,
Дзе ўсё дрыжыць, звініць напеўным звонам.
І колькі з’яў і чар
У памяці захована з былога,
Дзяцінства ясных мар,
Прывабна скарб і дар,
    Як першая ў жыцці мая дарога![5]

[2] Там жа.

[3] С. Скаруліс, *„Лістападаўская справа” і Якуб Колас*, „Полымя”, 1992, № 11, с. 221.

[4] Д. Міцкевіч, *Любіць і помніць. Успамінае сын Якуба Коласа*, Мінск 2000, с. 42.

[5] Я. Колас, *Збор твораў у чатырнаццаці тамах*, Мінск 1972, т. 2, с. 88.

Другая частка твора, як дарэчы і большасць публіцыстычных артыкулаў і вершаў, прысвечаных Заходняй Беларусі, носіць выразна асуджальны характар. Творы будуюцца на прамым супастаўленні „паноў-ваяводаў”, што „сняць Польшчу ад можа да можа і крыважэрнымі вачыма паглядаюць на краіну Саветаў”[6], ксяндзоў – „жрацоў-блюзнераў”, якія

І „польскасць” тут праводзіцца
На ўвесь наш край смуродзіцца
Ксяндзоўская мана.
І веру каталіцкую
Падносяць нам і тыцкаюць. –
На чорта нам яна?[7]

Супрацьстаяць ім масы беларусаў, якім „няма месца між панамі і чыноўнікамі. Яны адзінокі і занядбаны ў сваім жыцці”[8]. Супраць іх „шырока практыкуюцца ваенна-палявыя суды, расстрэлы, шыбеніцы”[9], голас іх „губіцца ў крыках болю і пакуты дзесяткаў тысяч палітвязнаў (...), над імі чыняцца сярэднявечныя пыткі ў засценках панскіх дэфензіў”[10]. Якуб Колас, для якога ніколі не быў характэрны рэвалюцыйны экстрэмізм, вострае эмацыянальнае напружанне лірычнага пачуцця, ператвараецца ў гнеўнага апісальніка пакутаў народа. Лірычны герой вершаў перапоўнены помстай, нянавісцю. Агульны змрочны настрой вершаў рэзка кантрастуе з творамі, прысвечанымі „савецкай вёсцы” („Да 11 гадавіны Кастрычніка”, „Краіна Саветаў” і інш.). Напэўна, у гэтай пазіцыі пісьменніка выявілася найперш неабходнасць адпавядаць афіцыйнай ідэалогіі дзеля захавання асабістай бяспекі.

Хоць і ў адным са сваіх артыкулаў Я. Колас піша, што за польска-савецкай мяжой „загашана вогнішча беларускай культуры”[11], творчасць пісьменніка знайшла сваё месца ў культуры Заходняй Беларусі. Да прыкладу, газета „Народ” ад 30 красавіка 1928 г., паведамляючы аб выданні паэмы *Новая зямля*, так пракаменціравала гэты факт: „Гэта найцікавейшы й найвыдатнейшы твор беларускай літэратуры павінен быць у кожнага Беларуса”.

[6] Там жа, т. 11, с. 80.
[7] Там жа, т. 2, с. 38.
[8] Там жа, т. 11, с. 176.
[9] Там жа, т. 11, с. 86.
[10] Там жа, т. 11, с. 81.
[11] Там жа, т. 11, с. 86.

Творы паэта друкаваліся асобнымі выданнямі. Паводле *Нарысу жыцця і творчасці*, змешчанага ў 14 томе збору твораў Я. Коласа, у Вільні ў выдавецтве Б. Кляцкова выдавліся ў 1923 г. аповесць *У палескай глушы*, у 1927 г. – зборнік апавяданняў *Нёманаў дар*, у 1931 г. – аповесць *У глыбі Палесся.* У 1927 г. выйшлі юбілейнае выданне *Выбраны творы*, паэма *Сымон-музыка*, у выдавецтве газеты „Народ" – першая кніга (13 раздзелаў) паэмы *Новая зямля.*

Творы Я. Коласа нярэдка можна было ўбачыць на старонках газет і часопісаў. Цікавасць да творчасці паэта праяўлялі выданні самай рознай тэматычнай і ідэалагічнай накіраванасці, напрыклад, часопісы „Беларуская зарніца", „Беларуская культура", „Беларускі звон", „Маланка", „Народ", „Наша воля", „Снапок", „Сялянская гутарка", „Сялянская ніва", „Шлях" і інш.[12] А з газет, якія нам удалося знайсці, гэта „Сялянская ніва" (у 1927 г. друкаваліся ўрыўкі з паэмы *Сымон-музыка*), „Народ" (на працягу 1928 г. друкаваліся раздзелы паэмы *Новая зямля*). Газета „Беларуская крыніца" ў розныя гады друкавала на сваіх старонках урыўкі з паэмаў *Новая зямля*, *Сымон-музыка*, аповесцей *У палескай глушы*, *У глыбі Палесся.* Нярэдка „коласаўскія паэтычныя радкі служылі эпіграфамі да публіцыстычных выступленняў дзеячаў навукі, культуры і мастацтва, выкарыстоўваліся для азначэння важных патрыятычных рубрык"[13]. Для параўнання прывядзём цытату з артыкула Я. Коласа „Яны пратэстуюць", у якім выразна бачна афіцыйная пазіцыя пісьменніка адносна заходнебеларускай інтэлігенцыі: „У гэтых паноў-акул ёсць свае нахлебнікі і прыслужнікі – тыя самыя, што плаваюць у „Беларускай крыніцы" ды звоняць у „Беларускім звоне"[14] або „На магіле беларускай культуры, капанай вашымі рукамі і прытоптанай груба нагамі, фальшыва плачаце вы над лёсамі беларускага народу"[15].

Акрамя публікацый твораў Я. Коласа, у заходнебеларускім друку можна знайсці літаратуразнаўчыя артыкулы самага рознага зместу, прысвечаныя творчасці пісьменніка. Большасць з іх

[12] J. Traczuk, *Prasa białoruska w II Rzeczypospolitej (1918–1939)*, [w:] *Studia polono-slavica-orientalia. Acta Literaria*, t. XIII, Warszawa 1992, s. 261–312.

[13] Л. П. Мірачыцкі, *Тыднёвік „Крыніца" – папулярызатар творчасці Якуба Коласа ў старым і новым свеце (1917–1940)*, [у:] *Каласавіны. Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 35-годдзю Літаратурнага музея Я. Коласа*, Мінск 1994, с. 128.

[14] Я. Колас, *Збор твораў у чатырнаццаці тамах*, Мінск 1972, т. 11, с. 80.

[15] Там жа, с. 81.

складаецца з творчай біяграфіі паэта, пераліку яго асноўных паэтычных зборнікаў, нярэдка сустракаецца аналіз стылёвых асаблівасцей твораў Я. Коласа. Большасць такіх публікацый прымеркавана да юбілеяў пісьменніка, якія святкаваліся ў 1926 і 1936 гадах. Так цэлы нумар беларускага літаратурна-навуковага часопіса „Калосьсе" быў прысвечаны Я. Коласу.

Прычыну цікавасці да твораў паэта ў Заходняй Беларусі, яго запатрабаванасці беларускім культурна-асветніцкім рухам знаходзім у змесце выданняў. У большасці з прааналізаваных артыкулаў акцэнт робіцца на „сялянскасць" Якуба Коласа, вылучаецца яго незвычайнае веданне вёскі і душы селяніна. Язэп Святазар у артыкуле „Пясняр беларускай вёскі", коратка аналізуючы творчасць паэта, вылучае на першае месца згаданую адметнасць яго творчасці. Гэта, на думку аўтара, робіць творы зразумелымі ўсякаму, „хоць крыху граматнаму селяніну", які „зразумее і адчуе, бо піша гэтакі ж як ён селянін"[16]. Тая ж думка, што „Якуб Колас – найвялікшы сялянскі пясняр Беларусі" гучыць і ў артыкуле да 20-годдзя творчасці пісьменніка ў газеце „Народны звон"[17]. Прычым акцэнт ставіцца на аналізе творчасці Якуба Коласа як культурна-асветніцкага дзеяча беларускага Адраджэння: „барацьбіт за беларускую народную школу", „сябра Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады", узгадваецца яго ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе. І. Дварчанін у тым жа нумары „Народнага звону", аналізуючы творчы шлях Я. Коласа, разглядае яго менавіта як „прадстаўніка нашаніўскай пары", як „паэта-селяніна". Пры гэтым даследчык дае высокую адзнаку мастацкай вартасці творчасці паэта: „Кавалкі *Новай зямлі* і цэлая паэма *Сымон-музыка* ставяць Коласа (...) на вышыню пісьменства сусветнага значэння"[18]. Называючы паэта „наш вялікі селянін", аўтар шкадуе аб недахопе „ўзроку крытыкі іншых народаў", што перашкаджае ацэнцы твораў Я. Коласа „як належыць, па вартасці".

Усе артыкулы без выключэння падкрэсліваюць геніяльнасць Коласа-пейзажыста, яго набліжанасць да свету прыроды, „беспасрэднае з ёй сяброўства і яе любасць"[19], талент у „маляванні" родных пrastораў.

[16] J. Świetazar, *Piaśniar biełaruskaje wioski (Z nahody 20-letniaha jubileju literaturnaj tworčaści Jakuba Kołasa)*, „Biełaruskaja Krynica. Tydniowaja sialanskaja hazeta", 1926, nr 46, 24 śnieżnia, s. 5.

[17] „Narodny Zwon", 1926, nr 1, 7 śnieżnia, s. 2.

[18] І. Дварчанін, *Аб творчасці Якуба Коласа*, „Narodny Zwon", 1926, № 1, 7 śnieżnia, c. 3.

[19] „Narodny Zwon", 1926, nr 1, 7 śnieżnia, s. 5.

На добрым літаратуразнаўчым узроўні, шырока, рознапланава аналізуецца творчасць юбіляра на старонках „Калосься”. Аўтар аналізуе не толькі ўсю творчасць Я. Коласа, уключаючы „пралетарскі” перыяд, але і робіцца ім спроба прасачыць мастацкую эвалюцыю твораў. Сярод дадатных бакоў творчасці паэта вылучаюцца: здольнасць „абуджаць нацыянальныя і грамадскія пачуцці не словамі, не лозунгамі, а паэтычнымі вобразамі”, „духоўная раўнавага”, „спакойны гумар”, „фатаграфічная праўдзівасць апавядання”[20]. Пры аналізе „пралетарскіх” твораў Коласа побач з канстатацыяй кардынальных зменаў у творчых арыенцірах (вершы „папросту агітацыйнага характару”, „адзначае выразную творчую эвалюцыю адрачэнне ад «наццэмаўшчыны»”) адчуваецца моцная сімпатыя да паэта, жаданне апраўдаць яго. Так хуткае прыстасаванне да „савецкага сацыяльнага жыцця” тлумачыцца творчай адметнасцю пісьменніка, як „маляра жыцця”, дапускаецца нават магчымасць і таго, што Колас сапраўды мог захапіцца зменамі, якія прынёс новы палітычны лад[21].

Акрамя артыкулаў літаратуразнаўчага зместу ў друку знаходзім артыкулы-ўспаміны, артыкулы-рэфлексіі, нават палымяныя публіцыстычныя развагі. Так вельмі кранае сваёй цеплынёй успамін-нататка А. Уласава „Якуб Колас і «Наша ніва» (успаміны)”. Вядомы дзеяч беларускага Адраджэння фактычна не закранае літаратурную дзейнасць паэта, ён толькі з незвычайнай пяшчотай, авеянай рамантычным шкадаваннем па днях маладосці, узгадвае няпростыя гады пачатку стагоддзя: першую сустрэчу з Я. Коласам, наведванні паэта ў турме[22]. Ва ўспамінах А. Станкевіча „У «палоне» паэзіі Якуба Коласа (з нагоды 30-летняга юбілею яго літаратурнага творства)” мы не знаходзім згадак пра жыццё і дзейнасць пісьменніка, але гэты твор – цудоўнае эсэ, у якім выдатна паказваецца выключная роля Я. Коласа ў фармаванні патрыятычнай свядомасці аўтара: „А калі жаданьні нашы споўняцца, дык хто ж утрымае тон гэтай музыкі на аднэй вышыні, на аднэй роўнай, нефальшывай ноце?.. Зробіць гэта той, хто як вецер у восеньскую ноч жаласна плача ў пушчы – Беларусі, галосячы над народам сконам, хто як родная маці над калыскай дзіцяці свайго бязсонна ночку каратае, пяець аб

[20] *** *На пройдзеным шляху (У 30-ыя ўгодкі творчае працы Якуба Коласа)*, „Калосьсе”. Беларускі літаратурна-навуковы часопіс, Вільня, 1936, № 5, с. 263.

[21] Там жа, с. 276.

[22] А. Уласаў, *Якуб Колас і „Наша ніва” (успаміны)*, „Калосьсе”. Беларускі літаратурна-навуковы часопіс, Вільня, 1936, № 2, с. 296.

долі-нядолі свайго роднага народу, яго будучыню гадае, хто сам ёсць жывой Беларусяй, люстрам пакутнага жыцьця яе, той, хто будучы вучыцелям-народнікам шмат і вельмі шмат мае з намі... Зробіць гэта (...) паэтычная думка таго, каму імя Якуб Колас"[23]. Ва ўспамінах А. Станкевіча Я. Колас паўстае фактычна сакральным аб'ектам беларускага Адраджэння, яго імя сімвалізуе барацьбу за лепшую будучыню Радзімы.

Лаўрын Сяліба, пафасна разважаючы аб мастацкім генезісе класіка, таксама дае выключна высокую адзнаку творчасці Якуба Коласа, што „знайшоў шлях, які вядзе яго – сына народу – да самога народу"[24]. Аўтар бачыць прымяненне творчага генію Я. Коласа менавіта ў культурна-асветніцкай дзейнасці, бо менавіта паэт з'яўляецца „падпорай вялікага гмаху ўселюдзкай культуры"[25].

Кожнай нацыі, якая нараджаецца, патрэбны народны паэт, творчая асоба, якая б на высокамастацкім, высокаэстэтычным узроўні здолела выразіць памкненні, ідэалы свайго народу, прароча акрэсліць праграму нацыянальнага развіцця. Гэта постаць так ці інакш аказваецца на мяжы культурнага, літаратурнага, а часам і палітычнага працэсаў, дае моцны творчы імпульс развіццю нацыі. Імя гэтага чалавека па сутнасці ператвараецца ў легенду, міф, каб стаць сімвалам, які аб'ядноўвае здаровыя, пазітыўныя сілы грамадства. Адной з такіх знакавых фігур для беларусаў стаў Якуб Колас. „Сялянскасць" псіхікі паэта, якая выявілася ў ціхім і натхнёным выяўленні любові да родных палёў, лясоў, народу, рабіла яго зразумелым усім станам беларускага грамадства. Здольнасць самыя празаічныя і штодзённыя праявы рэчаіснасці годна ўвасобіць у літаратуры сур'ёзнай якасці, узняць на небывала высокі эстэтычны ўзровень, выразіць глыбінна ўнутранае і перажытае, пра самае важнае і набалелае сказаць проста і кранальна – усё гэта разам дазволіла Якубу Коласу стаць у поўным сэнсе сімвалам беларускага Адраджэння, неад'емнай часткай беларускай культуры XX стагоддзя. Пры гэтым непазбежным была поўная ідэалізацыя творчасці паэта, яго самога.

[23] А. Станкевіч, *У „палоне" паэзіі Якуба Коласа (з нагоды 30-летняга юбілею яго літаратурнага творства)*, „Калосьсе". Беларускі літаратурна-навуковы часопіс, Вільня, 1936, № 2, с. 294.

[24] Л. Сяліба, *Юбілей Клясыка – сьвята народу. Аб гэнэзысе клясыка*, „Калосьсе". Беларускі літаратурна-навуковы часопіс, Вільня, 1936, № 2, с. 291.

[25] Там жа, с. 292.

Пры складанні ідэалагічных канцэпцый рознага кшталту стараліся ўпісаць творчасць пісьменніка ў адпаведны кантэкст. Мастацкі багаж назапашаны быў пісьменнікам у „нашаніўскі перыяд” (сюды варта аднесці і паэмы *Новая зямля* і *Сымон-музыка*).

Так, у савецкай Беларусі Я. Колас стаў неад’емнай часткай „шчаслівага” сацыялістычнага жыцця, яго дэкламатарам і агітатарам, своеасаблівай візітоўкай, пісьменнікам-прыкладам, узорам. Хаця аб’ектыўна знізілася мастацкая вартасць твораў, сам Я. Колас не стварыў амаль нічога новага, у асноўным гэта былі творы на заказ, мастацкая рэакцыя на грамадскае жыццё, пісьменнік усё больш уцягваўся ў грамадска-палітычную дзейнасць пры гэтым паступова знікала „ўнутраная” сутнасць яго таленту, тое, што калісьці стала падставай для „ідэалізацыі”.

У Заходняй Беларусі постаць Я. Коласа таксама выкарыстоўвалася як знакавая фігура беларускага нацыянальнага руху. Усе вышэйзгаданыя эмацыянальныя выказванні ў бок пісьменніка павінны былі падкрэсліць яго ролю як кансалідуючага фактара. Дзеля гэтай высакароднай мэты скрозь пальцы глядзелі на дзейнасць Якуба Коласа ў БССР, на яго савецкую творчасць. Пры ўсім імкненні заходнебеларускай крытычнай думкі аб’ектыўна прааналізаваць творчасць паэта мы не знайшлі ніводнай не тое што негатыўнай, але нават і крытычнай заўвагі нават на апублікаваныя артыкулы пра Заходнюю Беларусь.